

# Ці ёсць будучыня ў дваровага парку?

## Былы авіятар у адзіночку высадзіў дэндрарый у гарадскім мікраараёне

**Уладзімір МОРАЎ — чалавек апантаны. У свае 82 гады амаль увесь дзень праводзіць на прыдамавой тэрыторыі, дзе яго намаганнямі створаны сапраўдны батанічны сад. Тут можна ўбачыць дрэвападобную півоню, воцатавае і каралавае дрэвы, хвойкі ў стылі «бансай», інжыр, авакада — усяго каля 200 розных відаў. Але паркавай зоне патрэбны належны догляд, а магчыма, і новыя падыходы ў дызайне. Ці знойдуцца памочнікі ў гэтай справе, напрыклад той жа Камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, створаны пры мясцовым ЖЭСе?**

### Ад ваенных гарадкоў да жылога мікраараёна

Нельга сказаць, што пенсіянер не сябруе з камунальнымі службамі. Хутчэй, наадварот. Уладзімір Віктаравіч з цеплынёй успамінае былога кіраўніка УЖРЭП Кастрычніцкага раёна Гродна, з якім 20 гадоў таму «замуцілі» гэты праект. Напачатку прывялі ў парадак пад'езд, «ажывілі» яго карцінамі і кветкамі. З дапамогай ЖЭСа пафарбавалі драўляныя канструкцыі. Затым задумкі перакінуліся на свабодную прыдамавую тэрыторыю. Так у горадзе з'явіўся першы дэндрарый у жылым мікраараёне.

— У 90-х тут быў прыватны сектар, але яго пачаў выцясняць шматпавярховы мікраараён, а старыя дамы зносілі, — расказвае пенсіянер. — Калі мы сюды прыехалі, тут раслі некалькі яблынь і тры клёны. Да таго ж дамы ўзводзіліся каля самай загружанай магістралі, таму стаяла задача — абараніць сябе ад шкоднага ўздзеяння выхлапных газаў. Мы былі першыя ў горадзе, хто стварыў такі парк у жылым мікраараёне.

### Удачы і правалы мясцовага дызайнера

Паралельна з азеляненнем стваралася немудрагелістая інфраструктура двара. Лаўкі, альтанка, дзіцячая пляцоўка...У дваровы пейзаж удала ўпісаліся тры валуны.

Перашкод на шляху стварэння зялёнай зоны аказалася нямала. То на адной інсталяцыі нешта зламана, то на другой. А тут яшчэ драўлянага мядзведзя пад'ядае нейкі жучок...

Пацікавілася, ці ёсць каманда аднадумцаў. Бо аднаму справіцца з такім аб'ёмам работы складана — трэба і прапалоць, і паліць, і падрамантаваць нешта. Як аказалася, час энтузіястаў застаўся ў мінулым. Многія з яго памочнікаў пераехалі, а тыя, хто прыйшоў, цікавасці да справы не праяўляюць. Раней дапамагалі і дзеці, збіраліся, палівалі са шланга, цяпер такіх няма.

— Паколькі гэта тэрыторыя ЖЭСа, ён сочыць таксама за парадкам, траву абкошваюць, УЖРЭП зрабіў два дзясяткі шпакоўняў, птушкі ўсе іх занялі, ёсць кармушкі і для сініц. Нядаўна амерыканскія клёны абрэзалі кардынальна. Напачатку жыхары абураліся, але я ім патлумачыў, што так дрэвы набудуць патрэбную форму, бо галіны навісалі, — расказаў Мораў. —Увогуле я ўдзячны нашым жыхарам, бо расходы на паліў кладуцца на ўсіх жыхароў пад'езда.

### Крокі «зялёнага» асяроддзя

Пытаюся: па якім прынцыпе вялося азеляненне двара? Адказ такі: насычаць наваколле кіслародам і стварыць утульны куток. Таму высадзіў хвойкі і елкі. Яны тут ёсць паўсюдна. Нават у стылі «бансай». Але каб хвойка прыжылася, трэба яе правільна пасадзіць.

Некаторыя віды вырошчваў «з нуля». Напрыклад, грэцкі арэх.

— Я прыйшоў на рынак, бачу — мужчына прадае арэхі, прыехаў з Сярэдняй Азіі, — расказвае Мораў. — Я кажу: хачу тут вырасціць арэх. Выберыце мне такіх, каб яны абавязкова ўзышлі. Ён выбраў мне 15 штук і нават грошай не ўзяў, так яму гэта ідэя спадабалася. Ды яшчэ падзяліўся са мной сакрэтам. Бо ў іх вырошчванні ёсць свае асаблівасці. Садзіць трэба на зіму, каб былі марозаўстойлівыя. Амаль усе і прыжыліся з лёгкай рукі гандляра.

Экзатычныя саджанцы вырошчваюць проста ў кватэры. Жонка Уладзіміра Віктаравіча прывезла з Ізраіля насенне рэдкіх раслін, яны цяпер растуць у гаршках ля пад'езда. Адно каралавае дрэва Мораў аддаў у расійскае консульства ў Брэсце, другое — у гарадскую бальніцу, дзе яму знайшлі месца ў холе са шкляным купалам. Добра прыжыліся авакада, інжыр. Раскінулася магонія падубалістная з жоўтым сувеццем. Шыкоўнымі кветкамі радуе вока бругмансія. Ружы завяршылі першае квітненне і рыхтуюцца да другога. З'явіліся новыя парасткі ў дзявочага вінаграда, які лічыцца дэкаратыўным.

Мораў няспынна расказвае пра кожную расліну. Успамінае, як паступова засаджвалі гэты куток. Напачатку звычайнымі бярозамі ды хвоямі, пазней пачалі прывозіць экзотыку. Добра прыжылося воцатавае дрэва. З Далёкага Усходу прывёз саджанец манчжурскага арэха.

Падыходзім да казачкага ядлоўцу, за якім будзе пасаджаны бэз. Пакуль яго няма, але для расліны адведзены цэлы куток. Далей растуць садовыя дрэвы — яблыні, вішні, слівы...

— Вось ціс, яго ягады чырвоныя і ядавітыя, — тлумачыць Мораў. — Ціс на Каўказе расце як дрэва, а ў нас больш як кустарнік. Ездзіў туды на адпачынак і прывёз саджанцы. У асноўным набываю пасадачны матэрыял за свае сродкі.

Праходзім па невялічкай бярозавай алеі. У глыбіні здаецца, што горад дзесьці далёка, а тут сапраўдны лясок, у якім спяваюць птушкі.

— Усяго гэтага магло і не быць, — кажа Уладзімір Віктаравіч. — Калісьці нам хацелі прыбудаваць да гэтага дома яшчэ некалькі пад'ездаў, але жыхары выступілі супраць і адстаялі, мы ездзілі на пасяджэнні гарсавета...

Ёсць і планы на найбліжэйшы час. Нядаўна па ўскрайку паркавай зоны праводзілі камунікацыі да прыпынначага павільёна. Усё перакапалі, і ўтварылася пустка, якую трэба засадзіць кустамі, каб стварыць зялёны бар'ер аўтатранспарту. Частка тэрыторыі ўжо засаджана новымі дрэўцамі.

— Тут столькі людзей бывае! Калі да каго-небудзь прыязджаюць госці, абавязкова вядуць сюды, паказваюць, — расказвае Уладзімір Васілевіч. — Калі гэта пачыналася, такога двара ў Гродне ні ў кога не было, тут шэсць разоў праводзіліся мерапрыемствы ў маштабе Беларусі. Былі два віцэ-прэм'еры, двойчы — міністры ЖКГ, калі абмяркоўваліся азеляненні гарадоў. Тады тут было вельмі прыгожа, праходзілі семінары з удзелам камунальных службаў усіх абласцей, мы былі піянерамі, цяпер больш шырока распаўсюджана. Побач мужчына таксама высадзіў невялікі палісаднік, і далей ёсць.

Кожны дзень хапае работы, таму Уладзімір Васілевіч увесь час заняты справай. Ці хацеў бы ён супрацоўнічаць з камітэтам тэрытарыяльнага самакіравання? Хоць Мораў чуў пра іх, але ніякіх адносін з мясцовым органам не мае. Можа, таму, што любіць рабіць па-свойму, без падказак.

— У мяне была вельмі складаная і цяжкая служба. Хапіла надоўга, таму цяпер займаюся тым, што мне падабаецца, — рэзюмуе ён сваё захапленне.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

**Леанід АБРАЖЭВІЧ, намеснік дырэктара УЖРЭП Кастрычніцкага раёна г. Гродна:**

*— Уладзімір Мораў робіць добрую справу, ён сапраўды стварыў утульны куток прыроды ў гарадскім асяроддзі, які радуе ўсіх жыхароў. Але з часам многае прыходзіць у заняпад, тыя ж канструкцыі, мяккія цацкі выцвітаюць, яны не маюць таго выгляду, іх варта было б мінімізаваць. Па гэтым пытанні мы неаднойчы сутыкаліся са скаргамі жыхароў. Наогул гэтая зона патрабуе новых падыходаў і ў пасадках, больш прадуманага размяшчэння раслін. Спадзяюся, што ў апантанага дызайнера будуць добрыя памочнікі, магчыма, у выглядзе камітэта грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання.*


Приорбанк RBI Group

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ИЮЛЯ 2019 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 1 июля 2019 | На 1 января 2019 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 116 605 | 118 563 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 391 195 | 341 219 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 564 122 | 720 934 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 439 187 | 259 362 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 522 555 | 2 342 303 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 281 | 45 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 26 923 | 22 354 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 179 173 | 183 364 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 1 346 | 1 542 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 990 | 4 974 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 27 853 | 34 757 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **4 270 230** | **4 029 417** |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 169 760 | 326 219 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 3 256 266 | 2 953 172 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 100 438 | 67 398 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 2 | 175 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 41 151 | 42 769 |
| **23** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **3 567 617** | **3 389 733** |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 86 148 | 86 148 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 126 738 | 126 738 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 88 742 | 90 049 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 400 985 | 336 749 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 702 613 | 639 684 |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **4 270 230** | **4 029 417** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ НА 1 ИЮЛЯ 2019 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 1 июля 2019 | На 1 июля 2018 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 138 063 | 112 907 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 39 798 | 25 809 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 98 265 | 87 098 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 93 227 | 82 062 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 43 560 | 37 014 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 49 667 | 45 048 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (1 424) | (768) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 29 241 | 20 773 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (323) | 5 818 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | (6 480) | (26 327) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 3 605 | 4 619 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 80 574 | 88 769 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 7 647 | 5 522 |
| 15 | Прибыль до налогообложения | 211 | | 97 290 | 94 624 |
| 16 | Расход по налогу на прибыль | 212 | | 22 053 | 24 682 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ** | **2** | | **75 237** | **69 942** |

Временно и. о. Председателя Правления В.В. Дедюль

Главный бухгалтер В.В. Манцивода

Финансовая отчетность размещена на интернет-странице банка:
**https://www.priorbank.by/kvartal-nye-otcety**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190



**Закрытое акционерное общество «Смолевичи Молоко»** (место нахождения: 222201, Минская обл., Смолевичский р-н., г. Смолевичи, ул. Социалистическая, д. 54б) сообщает, что директором ЗАО «Смолевичи Молоко» 25.07.2019 г. принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг. Формирование реестра акционеров осуществляется по состоянию на 25.07.2019 г.

УНП 690668083



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 25 ліпеня 2019 года.**